# ГІСТОРЫЯ БІБЛІЯТЭК

***Галіеўская Я.В.*** *(Мінск)*

## «БЕЛАРУСЫ»

### Да гісторыі аддзела беларускай літаратуры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

### *Частка ІІІ. Супрацоўнікі*[1]

Каштоўнейшым багаццем беларускага аддзела былі яго супрацоўнікі, гэта іх намаганнямі ствараліся фонды і інфармацыйна-пошукавы апарат, абслугоўваліся чытачы, складаліся бібліяграфічныя паказальнікі, аказвалася метадычная дапамога бібліятэкам па пытаннях краязнаўства ў розных кутках рэспублікі. Таму, безумоўна, гісторыя аддзела – гэта яго супрацоўнікі, гэта вынікі іх працы. Імёны многіх з іх добра вядомы ў бібліятэчным свеце.

Загадчыкамі беларускага аддзела (у храналагічным парадку) былі Юлія Іосіфаўна Бібіла, Лізавета Давідаўна Івестфель (?), Ніна Барысаўна Ватацы, Адам Антонавіч Сакольчык, Мікалай Сямёнавіч Васілеўскі, Лізавета Ігнацьеўна Апацкая, Рыма Міхайлаўна Чыгірова, Людміла Мікалаеўна Рабок.

***Юлія Іосіфаўна Бібіла*** (1887 або 1897 – 1974) – першая загадчыца беларускага аддзела. Яна ўзначальвала аддзел з 1922 па 1937 г. Пра яе дзейнасць падрабязна расказваецца ў першай частцы артыкула. Яе імя ў гісторыі беларускай бібліяграфіі займае асобае месца. Гэта быў чалавек са складаным лёсам. *«Яна была*

---

[1] За дапамогу ў напісанні гісторыі беларускага аддзела аўтар вельмі ўдзячны Таццяне Іванаўне Рошчынай, Людміле Мікалаеўне Рабок, Святлане Іванаўне Сянькоўскай, Ларысе Мікалаеўне Навіцкай. Першая і другая часткі артыкула надрукаваны ў 14-м і 16-м выпусках зборніка «Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі».

*з кагорты змагароў, тых, якія працягвалі будаваць тады, калі, здавалася, увесь свет памешаны на разбурэннях»* [1]. Нягледзячы на ўсе выпрабаванні, якія былі на яе жыццёвым шляху, Ю.І. Бібіла не змяніла сваім поглядам і прынцыпам, да апошніх дзён жыцця думала пра людзей і будучае беларускай культуры. Пры яе спрыянні была складзена першая ў рэспубліцы краязнаўчая картатэка. Асабіста ёй былі складзены персанальныя картатэкі, прысвечаныя Я. Купалу, Я. Коласу, Ц. Гартнаму, З. Бядулі, Цётцы, а таксама картатэка па гісторыі беларускага тэатра. У час яе кіраўніцтва аддзелам бібліятэка набыла багатыя кнігазборы Я. Карскага, М. Янчука, Я. Коласа, Я. Дылы. На захаванне ў аддзел перадалі свае рукапісы Я. Купала, Я. Дыла, М. Грамыка, Я. Лёсік, К. Каганец. Юлія Бібіла мела ў беларускамоўным літаратурным асяроддзі аўтарытэт падзвіжніцы. Яна была выдатным спецыялістам у галіне беларусазнаўчай бібліяграфіі, прымала ўдзел у шматлікіх краязнаўчых канферэнцыях і выставах як на рэспубліканскім, так і на саюзным узроўні, супрацоўнічала з дзеячамі беларускай навукі і культуры. У 1924 г. на II Усесаюзнай канферэнцыі па



*Іл. 1.* Супрацоўнікі аддзела беларускай літаратуры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. На першым плане злева – Р.М. Чыгірова. Злева направа: Л.І. Апацкая, М.С. Васілеўскі, Л.М Бабкова, Н.Б. Ватацы, В.У. Баханькова. 60-я гг. ХХ ст.

краязнаўстве, што праходзіла ў Маскве, Ю.І. Бібіла прадстаўляла беларускую кнігу, выстава якой атрымала вялікі рэзананс [2].

З ёй звязана станаўленне і развіццё бібліяграфічнай службы бібліятэкі і ўзнікненне ў краіне бягучай і рэтраспектыўнай дзяржаўнай бібліяграфіі; ёй асабіста здзейснены рэтраспектыўны ўлік беларускай друкаванай прадукцыі з пачатку кнігадрукавання і да 1924 г. (гэта значыць да пачатку бягучай дзяржаўнай рэгістрацыі). За кароткі час, з 1927 па 1929 г., яна падрыхтавала чатыры выпускі «Летапісу беларускага друку», якія ў сукупнасці адлюстроўвалі беларускую друкаваную прадукцыю за дарэвалюцыйны час і першае дзесяцігоддзе савецкай улады [3].

Ю.І. Бібіла разам з А.А. Сакольчыкам склалі бібліяграфічны паказальнік «Асвета ў Беларускай ССР за 50 гадоў Савецкай улады» (Мінск, 1973); пры яе актыўным удзеле была падрыхтавана «Бібліяграфія па гісторыі Беларусі: феадалізм і капіталізм» (Мінск, 1969; складальнікі М.Г. Крэканэ і А.А. Сакольчык). Займалася яна і літаратурнай працай, пісала артыкулы і ўспаміны пра станаўленне аддзела беларускай літаратуры [4].

Абазначаныя ёй разам з І.Б. Сіманоўскім кірункі дзейнасці беларускага аддзела перадаваліся як эстафета – ад аднаго пакалення да другога.

Пошукі таго, хто ўзначальваў беларускі аддзел пасля Ю.І. Бібілы, прывялі мяне ў архіў бібліятэкі, дзе захоўваецца «Дело № 04-05. Книга учета личного состава библиотеки за 1938 г.». На с. 36 знаходзяцца звесткі пра склад супрацоўнікаў краязнаўчага (беларускага) аддзела, дзе адзначана, што загадчыца аддзела ***Лізавета Давідаўна Івестфель (?)*** (не ўпэўнена ў правільнасці напісання прозвішча – неразборлівы почырк). Яна нарадзілася ў 1902 г. у Оршы, мела вышэйшую адукацыю. Спачатку займалася педагагічнай дзейнасцю ў Асіповічах, з 01.01.1935 г. працавала ў бібліятэцы. На жаль, матэрыялы пра яе дзейнасць як загадчыцы аддзела пасля Ю.І. Бібілы не знойдзены.

Далей была вайна...

Адразу пасля вайны ў перыяд з 1945 па 1948 г. функцыі і абавязкі загадчыцы беларускага аддзела былі ўскладзены на ***Ніну Барысаўну Ватацы*** (1908–1997), якая згодна з загадам ад 18.08.1945 г. № 60 была залічана ў бібліятэку галоўным бібліятэкарам з 22.08.1945 г.

Ніна Барысаўна – вядомы бібліёграф і літаратуразнавец, адна з пачынальнікаў беларускай нацыянальнай бібліяграфіі, даследчык літаратурнай спадчыны М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа і інш. Сябра Саюза пісьменнікаў СССР, заслужаны дзеяч культуры БССР (1963), была ўзнагароджана медалямі «За доблестный труд в Великой Отечественной войне», «За трудовую доблесть» [5].

Ніна Барысаўна нарадзілася ў 1908 г. у Латвіі. У 1930 г. скончыла літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (БДУ) і прыйшла на працу ў Дзяржаўную бібліятэку БССР імя У.І. Леніна, дзе прайшла шлях ад памочніцы бібліятэкара да галоўнага бібліёграфа. Пасля арышту мужа была саслана ў Кіраў (Вятку), з 1936 па 1945 г. працавала ў бібліятэках Архангельска, Ульянаўска. З 1942 па 1945 г. Ніна Барысаўна была загадчыцай бібліятэкі эвакуацыйнага шпіталя № 1701. У жніўні 1945 г. па вызаве Саўнаркама БССР вярнулася ў Дзяржаўную бібліятэку БССР імя У.І. Леніна, дзе ўзначаліла аддзел беларускай літаратуры і бібліяграфіі, займалася збіраннем і аднаўленнем яго фондаў. У 1952 г. перайшла на бібліяграфічную работу на пасадзе галоўнага бібліёграфа. З 1952 г. пачала складаць бібліяграфічныя паказальнікі, прысвечаныя Я. Коласу, Я. Купалу, К. Чорнаму, К. Крапіве, М. Лынькову, П. Глебку і інш. Яна з’яўлялася складальнікам бібліяграфічнага паказальніка «Белорусская литература», які выйшаў з друку ў Маскве ў 1957 г. У 1962 г. быў выдадзены першы том бібліяграфічнага паказальніка «Мастацкая літаратура Савецкай Беларусі (1917–1960)», у 1970 г. – яго другі том (за 1961–1968 гг.), у 1964 г. – «Беларускае літаратуразнаўства і крытыка (1945–1963)», у 1966 г. – «Беларуская савецкая драматургія» (1917–1965), у 1993 г. – працяг «Беларускай савецкай драматургіі (1966–1986)».

Ніна Барысаўна Ватацы марыла пра той час, калі ў Беларусі будзе створана цэлая серыя бібліяграфічных паказальнікаў, якія асвятляюць увесь шлях развіцця беларускай літаратуры ўвогуле і па асобных жанрах, а таксама пра зводны каталог беларускай краязнаўчай літаратуры.

Ніна Барысаўна займалася навуковай працай: з 1957 г. яна вяла пошукі матэрыялаў пра М. Багдановіча, надрукавала шэраг паэтычных і літаратуразнаўчых твораў паэта, якія раней не былі вядомы літаратуразнаўцам. Яна знайшла аўтограф зборніка вер-

шаў паэта «Зеленя» на рускай мове, сабрала шмат сямейных фотаздымкаў М. Багдановіча, пазнаёмілася з яго сваякамі. У 1975 г. выйшаў зборнік успамінаў і біяграфічных матэрыялаў пра М. Багдановіча «Шлях паэта», у які ўвайшла таксама яго эпісталярная спадчына. Асобным раздзелам у ім змешчаны артыкулы, у якіх дадзены новыя, раней невядомыя звесткі пра жыццё і дзейнасць М. Багдановіча. Ніна Барысаўна шмат гадоў працавала над яго складаннем, вяла пошукі ў архівах, перыядычным друку. У 1986 г. выйшла яе кніга артыкулаў «Шляхі». Яна была адным з ініцыятараў стварэння музея паэта. Сабраныя матэрыялы, аўтографы і фотаздымкі Ніна Ватацы перадала ў дырэкцыю літаратурнага музея М. Багдановіча, якая была створана ў 1981 г. Гэты збор стаў першым укладам у фонды музея і яго асновай.

Ніна Барысаўна працавала да 1990 г. – больш за 50 гадоў аддала бібліятэцы. Мне, як і многім маім калегам, пашанцавала працаваць з ёй. Яна была вельмі інтэлігентным чалавекам, сапраўдным прыкладам служэння сваёй прафесіі. Да яе часта звярталіся чытачы, калегі па працы, беларускія пісьменнікі за кнігай, парадай, даведкай аб сваёй першай публікацыі. Мы жартавалі, што ні адзін пісьменнік без Ніны Барысаўны не можа пайсці на пенсію. Больш падрабязныя ўспаміны пра яе надрукаваны ў часопісе «Бібліятэчны свет» [6].

«*Засталася памяць. Памяць пра незабыўную Ніну Барысаўну – галоўнага бібліёграфа аддзела беларускай літаратуры. Памяць пра яе ўнікальныя энцыклапедычныя веды, мужнасць і прыгажосць, апантанасць бібліяграфіяй і спагадлівае станаўленне да чытачоў – многія з якіх, прайшоўшы праз беларускі аддзел былой "Ленінкі" (цяпер Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі), у сваім даробку абавязаны менавіта Ніне Барысаўне. Свой куточак у аддзеле, куточак утульны і нейкі незвычайны, мабыць сваёй святасцю, яна пакідала позна вечарам з апошнімі чытачамі*» [7] – так напісаў пра яе адзін з чытачоў беларускага аддзела вядомы гісторык В.У. Скалабан.

***Адам Антонавіч Сакольчык*** (1896–1983) узначальваў аддзел з 1948 па 1961 г. У 1915 г. скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, у 1925 г. – педагагічны факультэт БДУ, дзе атрымаў адукацыю выкладчыка геаграфіі. Ваяваў на франтах Першай сусветнай, грамадзянскай, Вялікай Айчыннай войнаў, быў узнагаро-

джаны медалямі «За боевые заслуги», «За победу над Германией». Выкладаў у сярэдніх школах Мінска, на рабфаку БДУ і Мінскага медыцынскага інстытута. У Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У.І. Леніна А.А. Сакольчык працаваў да 1965 г.: з 1946 па 1948 г. загадчыкам Кніжнай палаты, з 1948 па 1961 г. загадчыкам аддзела беларускай літаратуры і бібліяграфіі [8].

Ва ўспамінах тых, хто асабіста быў знаёмы з Адамам Антонавічам, мы бачым выдатнага прафесіянала ў сваёй справе, чалавека вельмі добрай душы, з цудоўным пачуццём гумару. Г.Ф. Грышына ў сваіх успамінах пісала: «*Удивительный человек! В начале своей трудовой деятельности встретить такого человека – большое счастье. Когда Сакольчик уходил на пенсию, я очень горевала. Для всех нас это был наставник с большой буквы*» [9]. Аб ім у першую чаргу гавораць працы, якія ён пакінуў пасля сябе. Адам Антонавіч вядомы ў бібліятэчным і навуковым свеце як складальнік такіх значных бібліяграфічных прац, як «Русская дореволюционная книга о Белоруссии, 1802–1916 гг.» (Мінск, 1964) і дапоўненага і перапрацаванага выдання «Дооктябрьская книга на русском языке о Белоруссии, 1768–1917 гг.» (Мінск, 1976), «Бібліяграфія па гісторыі Беларусі: феадалізм і капіталізм» (Мінск, 1969), «Асвета ў Беларускай ССР за 50 гадоў Савецкай улады» (Мінск, 1973) і інш. Без створаных ім бібліяграфічных паказальнікаў цяжка ўявіць сабе абслугоўванне ў беларускім аддзеле – не было таго дня, калі б мы не звярталіся да яго «Дооктябрьской книги…». Яны, без перабольшвання, былі, ёсць і будуць настольнымі кнігамі для бібліятэкараў і чытачоў.

***Мікалай Сямёнавіч Васілеўскі*** (1928–1989) быў загадчыкам аддзела з 1961 па 1968 г. Доктар філалагічных навук, прафесар, вядомы беларускі мовазнавец. У 1954 г. ён скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М. Горкага, настаўнічаў на Случчыне. Прага да ведаў, да новага, непазнанага прывяла М.С. Васілеўскага ў Дзяржаўную бібліятэку БССР імя У.І. Леніна, дзе ён працаваў загадчыкам аддзела беларускай літаратуры і бібліяграфіі. За час яго працы было зроблена нямала. Ён з’яўляецца складальнікам бібліяграфічных даведнікаў «Маладыя пісьменнікі Беларусі» (Мінск, 1964), «Пятрусь Броўка: да 60-годдзя з дня нараджэння» (Мінск, 1965) і кнігі «Краязнаўчая работа абласных бібліятэк БССР у 1964 г.» (Мінск, 1965). Любоў да Бацькаўшчыны выявіла-

ся ў яго краязнаўчай дзейнасці – Мікалай Сямёнавіч займаўся аналізам краязнаўчай работы ў рэспубліцы. Ён пакінуў пасля сябе добрыя ўспаміны ў тых, хто ведаў яго асабіста. Гэта быў выдатны навуковец, шчыры працаўнік, сціплы, добразычлівы, неймавернай працаздольнасці чалавек. «*Памяць пра Міколу Васілеўскага – выдатнага навукоўцу, шчырага працаўніка, сціплага чалавека, аддананага і добразычлівага калегу заўсёды жыве ў сэрцах і душах усіх, хто працаваў з ім, вучыўся ў яго, проста некалі з ім сустракаўся*» [10].



*Іл. 2.* Загадчык аддзела беларускай літаратуры Лізавета Ігнацьеўна Апацкая (1920–2001)

***Лізавета Ігнацьеўна Апацкая*** (1920–2001) узначальвала аддзел з 1968 па 1976 г. У гады вайны – сувязная партызанскага атрада «Разгром» у Мінскай вобласці, была ўзнагароджана медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны ІІ ступені» (1947). У 1946 г. скончыла БДУ і прыйшла на працу ў бібліятэку. Лізавета Ігнацьеўна як загадчыца аддзела паспяхова працягвала дзейнасць сваіх папярэднікаў: вяла раздзел «Летапісу друку БССР» – «БССР у друку СССР і замежных сацыялістычных краін», рабіла агляды краязнаўчай работы абласных бібліятэк, аналізавала стан гэтай работы, давала метадычныя рэкамендацыі. Яна з’яўляецца складальнікам паказальніка «Савецкая кніга пра Беларусь, 1946–1963» (ч. 2, Мінск, 1965). Гэта быў чалавек з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, якая ў поўным аб’ёме раскрывалася не толькі на пасадзе загадчыцы аддзела, але і ў дзейнасці старшыні мясцовага камітэта прафсаюза бібліятэкі – былыя калегі ў сваіх успамінах адзначаюць увагу Лізаветы Ігнацьеўны да новых

супрацоўнікаў – членаў прафсаюза, канкрэтную дапамогу ў праблемных сітуацыях і г. д. [11]. Яна была неабыякавай да людзей, і ў той жа час вельмі далікатнай, інтэлігентнай. За актыўную работу ў галіне бібліятэказнаўства і бібліяграфіі і як прафсаюзны работнік Л.І. Апацкая была ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

***Рыма Міхайлаўна Чыгірова*** ўзначальвала аддзел з 1976 па 1987 г. Яна нарадзілася ў Маскве ў 1934 г. у сям'і чыгуначнікаў. У 1957 г. скончыла геаграфічны факультэт БДУ. На працу ў Дзяржаўную бібліятэку БССР імя У.І. Леніна прыйшла ў 1961 г. Дырэктар бібліятэкі І.Б. Сіманоўскі хацеў запрасіць у аддзел беларускай літаратуры і бібліяграфіі менавіта географа-краязнаўца. Іосіф Бенцыянавіч разглядзеў у Рыме Міхайлаўне здольнасці да навуковай дзейнасці, хацеў, каб яна займалася бібліяграфазнаўствам, знаёміў яе з вядомымі бібліёграфамі СССР. Працуючы ў бібліятэцы, Р.М. Чыгірова скончыла вышэйшыя бібліятэчныя курсы, самастойна вывучала гісторыю і тэорыю бібліяграфіі, што ў далейшым прывяло яе ў аспірантуру пры Маскоўскім інстытуце культуры ў Хімках, якую яна таксама паспяхова скончыла [12].

У сваіх успамінах Рыма Міхайлаўна піша, што праца ў бібліятэцы з першых дзён захапіла яе: пастаянныя кантакты з людзьмі, дух творчасці, сяброўства, добразычлівасць, узаемадапамога панавалі ў тыя гады (ды і заўсёды) у беларускім аддзеле. Работа была цікавай, творчай, прыносіла радасць. Побач працавалі цудоўныя людзі, адданыя сваёй прафесіі. Рыме Міхайлаўне даручылі працаваць над тапаграфічнай картатэкай, і ў яе руках аказалася ўся Беларусь, дыферэнцыраваная па асобных мясцовасцях: абласцях, раёнах, гарадах, прыродных аб'ектах. Працуючы з картатэкай, яна ўнесла шэраг прапаноў па яе вядзенні і пашырэнні крыніц папаўнення. Работа з картатэкай, выкананне шматлікіх даведак садзейнічалі захапленню беларусазнаўствам і краязнаўствам і паслужылі пачаткам метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці [13].

Добрае веданне краязнаўчай літаратуры і шырокая эрудыцыя паспяхова прымяняліся Р.М. Чыгіровай і ў стварэнні бібліяграфічных даведнікаў. Высокую ацэнку бібліятэчнай грамадскасці атрымаў бібліяграфічны паказальнік «На прасторах Беларусі» (Мінск, 1968), адным з аўтараў якога была Рыма Міхайлаўна. Пазней яна прыняла ўдзел у падрыхтоўцы шэрагу бібліяграфічных паказаль-

нікаў, сярод якіх – «Беларуская ССР у Вялікай Айчыннай вайне Савецкага Саюза (1941–1945)» (Мінск, 1980), «Мікалай Мікалаевіч Улашчык» (Мінск, 1996) і інш.

Свае навуковыя інтарэсы Р.М. Чыгірова звязвала ў першую чаргу з вывучэннем беларускага бібліяграфазнаўства і краязнаўчай дзейнасці айчынных бібліятэк. Яна аўтар навуковых работ па беларускай бібліяграфіі, краязнаўчай дзейнасці бібліятэк, каардынацыі і кааперацыі ў гэтай галіне. Рыма Міхайлаўна займалася праблемамі фарміравання краязнаўчых фондаў і іх дэпазітарнага захоўвання, вывучэннем бібліяграфічнай забяспечанасці розных галін ведаў і сфер дзейнасці, у тым ліку беларусазнаўства і краязнаўства, распрацоўвала тэарэтычныя пытанні беларускай бібліяграфіі, беларусазнаўчага і краязнаўчага бібліяграфазнаўства, методыку краязнаўчай работы бібліятэк.

Рыма Міхайлаўна прымала актыўны ўдзел у навукова-метадычнай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (НББ). Ёй падрыхтаваны методыка-бібліяграфічныя рэкамендацыі «Краязнаўчая работа гарадскіх бібліятэк» (Мінск, 1972), «Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк» (Мінск, 1994). На працягу многіх гадоў яна ўдзельнічала ў павышэнні кваліфікацыі розных катэгорый бібліятэчных работнікаў краіны.

За 41 год працы ў НББ Р.М. Чыгірова прайшла шлях ад бібліятэкара да загадчыцы аддзела. Яна праводзіла ў бібліятэцы вялікую грамадскую работу, узначальвала мастацкую самадзейнасць.

Працы Р.М. Чыгіровай па-ранейшаму запатрабаваны спецыялістамі. Падтрымліваючы пераемнасць пакаленняў, яе прафесійную дзейнасць даследуюць у курсавых і дыпломных работах студэнты адпаведных факультэтаў вучэбных устаноў краіны.

***Людміла Мікалаеўна Рабок*** узначальвала беларускі аддзел у апошні перыяд яго дзейнасці – з 1987 па 2006 г. Яна нарадзілася ў 1949 г. У 1970 г. скончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М. Горкага па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» і ў гэтым жа годзе прыйшла на работу ў Дзяржаўную бібліятэку БССР імя У.І. Леніна. Працавала на пасадах вучонага сакратара, галоўнага бібліёграфа, загадчыцы аддзела. Сёння Л.М. Рабок на пенсіі, але працягвае працаваць у НББ. Яна ўзнагароджана Ганаровым знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Быць апошняй, як і быць першай, заўсёды нялёгка. Перыяд кіравання аддзелам супаў з часам шматлікіх перамен, звязаных з

аўтаматызацыяй усіх працэсаў бібліятэчнай дзейнасці – яны пачаліся ў бібліятэках у 1990-я гг. Адным з этапаў комплекснай аўтаматызацыі бібліятэчных працэсаў стала рэкаталагізацыя беларускага фонду НББ. Было прынята рашэнне аб рэтраканверсіі традыцыйнага карткавага алфавітнага каталога, які адлюстроўваў кніжны фонд беларускага аддзела. Для яе рэалізацыі ў аддзеле была створана спецыяльная група супрацоўнікаў. Вопыту стварэння электронных каталогаў у краіне не было, таму можна ўявіць, якая вялікая адказнасць па арганізацыі гэтай працы ў аддзеле была ўскладзена на Л.М. Рабок.

Значнай падзеяй у 1990-я гг. з’явілася прыняцце закона аб мовах, наданне беларускай мове статусу дзяржаўнай, а бібліятэцы статусу нацыянальнай, што садзейнічала павелічэнню прытоку літаратуры на беларускай мове ў фонды беларускага аддзела (як і ў самым пачатку існавання беларускага аддзела ў 1920-я гг. у перыяд беларусізацыі – гісторыя паўтараецца), вяртанню са спецсховаў у аддзел літаратуры абмежаванага доступу, якая становіцца агульнадаступнай, наладжванню сувязей з суайчыннікамі за мяжой праз Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» і г. д. Людміла Мікалаеўна шмат рабіла для таго, каб фонды НББ папоўніліся выданнямі беларускага замежжа: устанаўліваліся асабістыя кантакты з найбольш вядомымі дзеячамі, такімі як Вітаўт і Зора Кіпелі, якія сабралі і перадалі НББ калекцыю выданняў беларускага замежжа – каля 700 адзінак кніг і часопісаў.

Фарміраванню фондаў аддзела, рабоце з імі былі прысвечаны наступныя навуковыя публікацыі Л.М. Рабок: «Рэкаталагізацыя беларускага фонду НББ» (2004) [14], «Праблемы фарміравання калекцыі нацыянальных дакументаў і фондаў беларусікі» (1993) [15], «Праблема фарміравання базы даных і фонду “беларусіка”» (1992) [16], «Выданні беларускага замежжа ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі» (1995) [17] і г. д.

У сувязі з пераездам бібліятэкі ў новы будынак на плечы кіраўніка аддзела лягло шмат задач і пытанняў па яго далейшым лёсе – у новай структуры НББ існаванне комплекснага беларускага аддзела не было прадугледжана. Разам з рэарганізацыяй працы Л.М. Рабок трэба было вырашыць пытанне па працаўладкаванні супрацоўнікаў. У гэты хвалюючы момант яна падтрымлівала супрацоўнікаў, старалася ўладкаваць кожнага (адпаведна яго здольнасцям) там, дзе для бібліятэкі будзе больш карысці ад кожнага з нас.

Апошняе дзесяцігоддзе існавання беларускага аддзела было асабліва напружаным. Прафесіяналізм, пачуццё гумару і аптымізм, асабісты прыклад загадчыка мелі вялікае значэнне для выканання задач, пастаўленых перад аддзелам і яго супрацоўнікамі. І цяпер, нягледзячы на тое, што былыя супрацоўнікі беларускага аддзела працуюць у розных структурных падраздзяленнях бібліятэкі, мы працягваем сустракацца, успамінаць аддзел, дзе нам было ўтульна і цікава працаваць.

Мае асабістыя ўспаміны і ўражанні аб аддзеле пачынаюцца з таго моманту, калі я прыйшла працаваць у «Ленінку» (так называлі бібліятэку ў той час) пасля заканчэння Мінскага інстытута культуры ў 1981 г. Я была ўпэўнена, што калі працаваць у «Ленінцы», то толькі ў беларускім аддзеле. Яго называлі «бібліятэка ў бібліятэцы». Вузкі, цемнаваты калідор аддзела, дзе заўсёды было шмат чытачоў, якія размаўлялі, абмяркоўвалі, нават чыталі, хаця чытаць часам не было дзе: залы амаль заўсёды былі поўныя. Там жа знаходзілася так званая выставачная зала, дзе рабіліся змястоўныя выстаўкі. І працавалі там «беларусы». Гэтыя людзі, поўныя энергіі і сіл, рабілі сваю работу не толькі старанна, але і з пачуццём гонару за тое, што ўсё гэта сваё, роднае, беларускае, блізкае да сэрца. Розныя працэсы дзейнасці, цікавыя чытачы, работа з якімі прыносіла пачуццё запатрабаванасці.

У тыя гады ў аддзеле працавалі людзі, у якіх быў вялікі вопыт работы, яны былі сапраўднымі прафесіяналамі сваёй справы: Людміла Міхайлаўна Бабкова, Валянціна Усцінаўна Баханькова, Ася Анатольеўна Фрайман, Марыя Васільеўна Ганчарова, Раіса Фёдараўна Сіпакова, Ларыса Мікалаеўна Навіцкая, Тамара Васільеўна Непарожная, Валянціна Міхайлаўна Вялічка, Валянціна Аляксандраўна Лявонава, Надзея Фёдараўна Доўнар і г. д. Там працавалі і выраслі да загадчыкаў іншых аддзелаў Валянціна Карнееўна Жак, Таццяна Іванаўна Рошчына, Наталля Пятроўна Зелянеўская, Святлана Аляксандраўна Пугачова, Тамара Канстанцінаўна Радзевіч, Людміла Георгіеўна Стружэцкая. Школу беларускага аддзела прайшлі Алена Іванаўна Касінская, Раіса Сяргееўна Собаль, Таццяна Рыгораўна Рабушка, Святлана Іванаўна Сянькоўская, Дзмітрый Мікалаевіч Давідоўскі, Галіна Іванаўна Антонава, Раіса Канстанцінаўна Казючыц, Ларыса Іванаўна Турбан, Таццяна Мікалаеўна Кунда, Вольга Аляксандраўна Шугаева,

Людміла Данілаўна Сільнова, Святлана Арнольдаўна Коцік, Наталля Міхайлаўна Баркун, Лідзія Паўлаўна Слыхоўская, Галіна Антонаўна Ганчар і інш. Пра кожнага з гэтага няпоўнага пераліку супрацоўнікаў, якім давялося працаваць у беларускім аддзеле, ёсць што сказаць, кожны з іх на сваім працоўным месцы старанна выконваў свае службовыя абавязкі.

У пацвярджэнне гэтай думкі хочацца прывесці некалькі прыкладаў.

***Дзмітрый Мікалаевіч Давідоўскі***, шмат гадоў працуючы ў кнігасховішчы аддзела, настолькі добра ведаў яго фонд, што памятаў шыфры кніг: пакуль чытач запаўняў патрабаванне, ён выносіў неабходную кнігу. Заслужыў аўтарытэт і павагу як у чытачоў аддзела, так і ў супрацоўнікаў бібліятэкі, якія звярталіся да яго асабіста са сваімі пытаннямі.



*Іл. 3.* Супрацоўнікі аддзела беларускай літаратуры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. У першым радзе (злева направа): Т.І. Рошчына, Н.Б. Ватацы, Р.М. Чыгірова, Л.М Бабкова, М.В. Ганчарова, Т.В. Непарожная. У другім радзе (злева направа): Л.М. Навіцкая, Д.М. Давідоўскі, В.У. Баханькова, Р.Ф. Сіпакова, Т.Р. Рабушка, С.І. Сянькоўская, Т.К. Радзевіч, А.І. Касінская, В.А. Лявонава. Пачатак 80-х гг. XX ст.

***Валянціна Аляксандраўна Лявонава*** і ***Святлана Іванаўна Сянькоўская*** як загадчыкі сектара кнігасховішча шмат рабілі для арганізацыі і захавання фонду нацыянальных дакументаў, нават у няпростых умовах старога будынка. Фонд неаднаразова прыходзілася перамяшчаць, перавозіць у іншыя памяшканні, абяспыльваць, рыхтаваць да пераезду ў новы будынак бібліятэкі і г. д.

***Лідзія Паўлаўна Слыхоўская*** і ***Галіна Антонаўна Ганчар*** узначальвалі групу супрацоўнікаў па ўводзе беларускай рэтраспекцыі ў электронны каталог – вопыту такой работы яшчэ не было.

Больш падрабязна трэба расказаць пра супрацоўнікаў аддзела, якія пакінулі пасля сябе канкрэтныя вынікі працы, якімі мы працягваем карыстацца і цяпер.



*Іл. 4.* Супрацоўнікі аддзела беларускай літаратуры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. У першым радзе (злева направа): Т.М. Кунда, Т.В. Непарожная. У другім радзе (злева направа): Л.Д. Сільнова, С.І. Сянькоўская, С.Л. Гаўрылава, Л.М. Рабок, Г.А. Ганчар, Л.П. Слыхоўская, Л.М Навіцкая (на першым плане), Я.В. Галіеўская, С.А. Коцік, Н.М. Баркун. Канец 90-х гг. XX ст.

Шмат гадоў працавала ў аддзеле ***Людміла Міхайлаўна Бабкова*** (1923–2000). Яна нарадзілася ў Мінску, у 1943 г. скончыла Казанскі авіяцыйны тэхнікум па спецыяльнасці «тэхнолаг», у 1955 г. – Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў, атрымала спецыяльнасць «настаўнік англійскай мовы сярэдняй школы», у 1958 г. – бібліятэчныя курсы пры Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У.І. Леніна. З 1955 г. працавала ў бібліятэцы на розных пасадах – ад бібліятэкара да галоўнага бібліёграфа. Яна ўнесла вялікі ўклад у справу станаўлення і арганізацыі даведачна-бібліяграфічнага апарату аддзела беларускай літаратуры і бібліяграфіі. У прафесійнай дзейнасці паспяхова выкарыстоўвала веданне замежных моў – англійскай, нямецкай, польскай. Людміла Міхайлаўна Бабкова працавала над складаннем раздзела «Летапісу друку БССР» – «БССР у друку СССР і замежных сацыялістычных краін», з’яўлялася складальнікам бібліяграфічных паказальнікаў «Замежная літаратура ў перакладзе на беларускую мову, 1917–1963» (Мінск, 1965), «Замежная літаратура на беларускай мове, 1964–1974» (Мінск, 1980). Людміла Міхайлаўна прымала вельмі актыўны ўдзел у грамадскай рабоце калектыву. Прыемны і ўважлівы чалавек, яна ніколі не павышала голасу, з усімі ў калектыве ладзіла, многія бралі з яе прыклад. Яна мела вялікі аўтарытэт у аддзеле, сярод супрацоўнікаў і чытачоў бібліятэкі.

***Валянціна Усцінаўна Баханькова*** (1925–2007) скончыла Магілёўскі педагагічны інстытут у 1949 г. і атрымала спецыяльнасць «настаўнік геаграфіі сярэдняй школы». Працавала ў беларускім аддзеле Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У.І. Леніна з 1965 г. бібліёграфам, рэдактарам, загадчыцай сектара кнігасховішча. На работу прыходзіла раней за ўсіх – у 8 гадзін раніцы, хаця праца пачыналася ў 8.30. Валянціна Усцінаўна была сапраўднай гаспадыняй, за ёй цяжка было ўгнацца нават маладым, столькі ў яе было сіл і энергіі. Вельмі сціплы чалавек, з прыгожымі вачыма і прыгожым почыркам. Як многія неабыякавыя людзі, валодала неспакойным характарам у лепшым сэнсе гэтага слова, пачуццём калектывізму, шмат дапамагала маладым супрацоўнікам. Выключна працавітая, адказная, Валянціна Усцінаўна прафесійна абслугоўвала чытачоў, вяла картатэку персаналій, арганізоўвала выстаўкі, аказвала дапамогу музеям у падборы неабходных матэрыялаў, кваліфікавана выконвала складаныя даведкі і заяўкі па

міжбібліятэчным абанеменце. Яе фразу: «Захочаш – знойдзеш», – памятаюць усе «беларусы», якія з ёй працавалі. «Раз чытач напісаў, значыць ён аднекуль гэта ўзяў, і наш абавязак – знайсці», – заўсёды казала В.У. Баханькова. Яна ўдзельнічала ў складанні бібліяграфічнага штоквартальнага паказальніка «Беларуская ССР у гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1941–1945)», у той час адзінага ў СССР па гэтай тэматыцы, разам з іншымі супрацоўнікамі працавала над сумесным з Інстытутам гісторыі Акадэміі навук БССР рэтраспектыўным паказальнікам «Беларуская ССР у Вялікай Айчыннай вайне Савецкага Саюза» (вып. 2). Як загадчыца сектара шмат увагі ўдзяляла рабоце кнігасховішча: В.У. Баханькова валодала прыроднай гаспадарлівасцю, што дапамагала ёй у працы з фондам. Валянцінай Усцінаўнай шмат было зроблена па арганізацыі працы кнігасховішча, паляпшэнні яго дзейнасці.

***Марыя Васільеўна Ганчарова*** (1940–1996) у 1962 г. скончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М. Горкага па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства». Працавала ў беларускім аддзеле Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У.І. Леніна з 1968 г. загадчыцай сектара арганізацыі даведачна-бібліяграфічнага апарату, галоўным бібліёграфам. Яна вяла картатэку «БССР у друку СССР і замежных сацыялістычных краін», удзельнічала ў падрыхтоўцы і ажыццяўляла поўную рэдакцыю раздзела «Летапісу друку БССР» – «БССР у друку СССР і замежных сацыялістычных краін». Марыя Васільеўна валодала ўсімі бібліяграфічнымі працэсамі, паспяхова вучыла маладых супрацоўнікаў гэтай справе. Яна з’яўлялася высокакваліфікаваным спецыялістам у галіне беларускай бібліяграфіі, вяла метадычную работу па краязнаўстве [18]. Марыя Васільеўна прымала актыўны ўдзел у грамадскім жыцці калектыву бібліятэкі. Адметным для М.В. Ганчаровай было яе добрае стаўленне да людзей, да тых, хто працаваў з ёй даўно, і да тых, у каго толькі пачыналася працоўнае жыццё: па-мацярынску цёпла яна сустракала ўсіх, хто рабіў першыя крокі ў сваёй працоўнай дзейнасці.

***Раіса Фёдараўна Сіпакова*** нарадзілася ў 1935 г. У 1959 г. скончыла беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта БДУ. У 1967 г. прыйшла ў бібліятэку, дзе працавала ў беларускім аддзеле на розных пасадах – ад бібліятэкара да загадчыцы сектара. Раіса Фёдараўна – працавіты, сціплы, вельмі адказны чалавек. Сваімі

асабістымі адносінамі да работы паказвала прыклад астатнім, на ўсе падзеі адклікалася адна з першых. Як загадчыца сектара па абслугоўванні Р.Ф. Сіпакова адказвала за арганізацыю яго работы ў аддзеле, падтрымлівала добрую традыцыю – не пакідаць без увагі ні адзін нявысветлены запыт чытачоў.

Раіса Фёдараўна кваліфікавана выконвала складаныя пісьмовыя даведкі, рабіла агляды беларускай мастацкай літаратуры. Яна з'яўлялася членам рэдакцыйнага савета выдавецтва «Літаратура і мастацтва». Разам з Н.Б. Ватацы і М.А. Каваленка падрыхтавала рэкамендацыйны бібліяграфічны даведнік «Белорусская литература» (Москва, 1988).

Раіса Фёдараўна з'яўлялася настаўнікам моладзі, карысталася заслужанай павагай чытачоў і супрацоўнікаў.

З асаблівым пачуццём удзячнасці хочацца адзначыць ***Ларысу Мікалаеўну Навіцкую*** за яе адносіны да працы, да людзей, за дапамогу мне і ўсім, хто да яе звяртаўся. Ларыса Мікалаеўна нарадзілася ў 1946 г., у 1968 г скончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М. Горкага па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства». Працавала ў беларускім аддзеле Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У.І. Леніна з 1968 г. і прайшла шлях ад бібліятэкара да галоўнага бібліёграфа. Яна валодала асаблівым талентам работы з чытачамі, выканання самых складаных даведак, дасканала валодала методыкай бібліяграфічнага пошуку – пісьмовыя даведкі для спецыялізаванай юрыдычнай кансультацыі «Белінюркалегія» выконвала толькі Л.М. Навіцкая. Веданне фондаў, сістэмы пошуку, уменне выкарыстаць патрэбныя крыніцы заўсёды давалі плённыя вынікі. Вельмі сціплы, адказны чалавек, мой настаўнік, аўтарытэт, чалавек выключнай памяці. Яе называлі «хадзячай энцыклапедыяй», сапраўдным «бібліятэчным Шэрлакам Холмсам».

Ларыса Мікалаеўна – высокапрафесійны бібліёграф. Яна ўдзельнічала ў падрыхтоўцы раздзела «Летапісу друку БССР» – «БССР у друку СССР і замежных сацыялістычных краін», марыла пра тое, каб ён вырас да самастойнага, добра афармленага выдання. Ларыса Мікалаеўна з'яўляецца складальнікам бібліяграфічных паказальнікаў «Библиотечное дело в Белоруссии, XVI в. – 1917 г.» (Мінск, 1982), «Докторские и кандидатские диссертации по историческим наукам БССР, 1944–1987» (Мінск, 1988; у суаўтарстве з У.М. Міхнюком). Разам з Н.Б. Ватацы працавала над складаннем навукова-дапаможнага паказальніка «Беларуская савецкая

драматургія, 1966–1986» (Мінск, 1993) і г. д. Як спецыяліст вышэйшай кваліфікацыі Л.М. Навіцкая аказвала метадычную і кансультацыйную дапамогу бібліятэкам краіны па пытаннях краязнаўства. Яна дагэтуль карыстаецца заслужаным аўтарытэтам у супрацоўнікаў і чытачоў НББ.

***Тамара Васільеўна Непарожная*** нарадзілася ў 1945 г., у 1970 г. скончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М. Горкага па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства». У гэтым жа годзе прыйшла на работу ў Дзяржаўную бібліятэку БССР імя У.І. Леніна. Працоўная дзейнасць Т.В. Непарожнай пачалася з аддзела апрацоўкі і каталогаў. У 1976 г. яе перавялі ў сектар зводнага каталога аддзела беларускай літаратуры, дзе яна разам з Т.К. Радзевіч працавала над раздзеламі «Выданні на беларускай мове, XIX – пачатак XX ст.», «Выданні на рускай мове, XIX – пачатак XX ст.» зводнага каталога «Кніга Беларусі (1517–1917)». Гэта была вельмі адказная дзейнасць – бібліяграфаванне нацыянальнай літаратуры для першага ў Беларусі зводнага друкаванага каталога, складанне рэпертуару нацыянальнай кнігі рэспублікі. Стварэнне зводнага каталога з'явілася значным укладам у развіццё беларускай культуры. Гэта выданне – гордасць бібліятэкі.

Тамара Васільеўна была загадчыцай сектара каталогаў і картатэк беларускага аддзела, з'яўлялася членам каталожнай камісіі, выконвала даведкі, якія былі звязаны з выяўленнем дарэвалюцыйных беларускіх выданняў. Яна вывучала праблемы арганізацыі і вядзення даведачнага апарату, па-дзелавому, прынцыпова вырашала вытворчыя пытанні, заўсёды была гатова дапамагчы. Тамара Васільеўна – чалавек з пачуццём гумару, з ёй было цікава і лёгка працаваць, яна ўмела наладзіць добрыя кантакты з супрацоўнікамі і чытачамі, карысталася аўтарытэтам як сярод калег па рабоце, так і сярод чытачоў.

***Раіса Канстанцінаўна Казючыц*** нарадзілася ў 1950 г. Пачаткам яе працоўнай дзейнасці была работа загадчыцай Даўгінаўскай сельскай бібліятэкі Уздзенскага раёна. У 1972 г. яна скончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М. Горкага па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства» і была накіравана на працу ў бібліятэку № 4 г. Мінска, а са снежня 1978 г. перайшла ў Дзяржаўную бібліятэку БССР імя У.І. Леніна старшым

бібліятэкарам у навуковую залу аддзела абслугоўвання. З 1981 па 1989 г. Р.К. Казючыц працавала на пасадзе загадчыцы сектара масавай работы гэтага аддзела. Маючы вялікі вопыт такой работы, паспяхова прымяняла яго ў далейшым у аддзеле беларускай літаратуры, дзе працягвалася яе працоўная дзейнасць. Раіса Канстанцінаўна як галоўны бібліятэкар на высокім прафесійным узроўні займалася арганізацыяй кніжных выставак у аддзеле, іх рэкламай на беларускім радыё і тэлебачанні. Вывучала пытанні краязнаўчай работы бібліятэк рэспублікі, аказвала ім метадычную дапамогу, чытала лекцыі па гісторыі развіцця краязнаўства краіны і краязнаўчай рабоце бібліятэк на курсах павышэння кваліфікацыі бібліятэчных работнікаў у Беларускім дзяржаўным інстытуце праблем культуры. Праводзіла аналіз краязнаўчай дзейнасці абласных бібліятэк, пісала агляды і артыкулы па краязнаўчай рабоце [19], перапрацавала Тыпавую схему класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь [20].

Раіса Канстанцінаўна працягвае і цяпер працаваць у НББ у зале беларускай літаратуры аддзела абслугоўвання спецыялізаванымі фондамі. Яна з'яўляецца настаўнікам моладзі, вучыць арганізацыі выставак, перадае свой вопыт. Вынікі гэтай дзейнасці заўважаны і ацэнены нашымі чытачамі.

Усе супрацоўнікі, каго я не ўпамянула, працавалі ў аддзеле вельмі нядоўга ці прыйшлі ў апошнія гады яго існавання. Маладыя спецыялісты набіраюцца вопыту ў больш сталага пакалення, з павагай і адказнасцю адносяцца да сваіх абавязкаў, падтрымліваюць традыцыі беларускага аддзела.

З 1981 па 2006 г. быў цікавы перыяд у маёй прафесійнай дзейнасці, які я буду ўспамінаць заўсёды. Ніколі не шкадавала, што працоўны лёс мой быў звязаны з беларускім аддзелам, – ёсць пачуццё гордасці, што мне пашчаслівілася быць у сваім родным асяроддзі, працаваць з такімі цудоўнымі людзьмі, ад якіх я многаму навучылася – не толькі прафесійным навыкам, але і жыццёвай мудрасці.

Беларускаму аддзелу на працягу ўсёй яго гісторыі існавання было наканавана лёсам быць асноўным, дамінуючым аддзелам у структуры НББ. Інакш не магло і быць: задачы і функцыі, якія былі нададзены яму ў пачатку існавання, вызначылі ў далейшым яго місію і ролю як для самой бібліятэкі, так і для краіны наогул.

Да канца свайго існавання беларускі аддзел заставаўся цэнтрам краязнаўчай дзейнасці ў рэспубліцы, месцам, дзе фарміраваўся і збіраўся нацыянальны фонд і арганізоўваўся даведачны апарат, дзе ствараліся фундаментальныя бібліяграфічныя паказальнікі, якія былі для карыстальнікаў бібліятэкі важнай крыніцай пошуку неабходнай інфармацыі, куды прыходзілі і звярталіся за дапамогай самыя розныя чытачы – ад студэнтаў да вядомых дзеячаў беларускай навукі і культуры – і атрымлівалі звесткі па розных пытаннях беларусазнаўчай тэматыкі. І выконвалі ўсю гэтую работу супрацоўнікі беларускага аддзела – «беларусы», сапраўдныя прафесіяналы ў сваёй справе, якую любілі і якой былі адданы.

ЛІТАРАТУРА

1. **Зачараваная** кнігай // Женский журнал. 2011. № 12. С. 60.

2. Там жа. С. 61.

3. **Зіміна, Р.** Юлія Іосіфаўна Бібіла : бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць / Р. Зіміна // Бібліятэчны свет. 2009. № 2. С. 30.

4. Там жа. С. 31.

5. **Из отчета** библиотеки за 1951 г. // С любовью о библиотеке : история библиотеки в воспоминаниях : к 80-летию Национальной библиотеки Беларуси / авт.-сост.: Л. М. Михальчук, Л. И. Курилина. Минск, 2002. С. 37.

6. **Галіеўская, Я.** Светлай памяці Ніны Барысаўны Ватацы : (да 100-годдзя з дня нараджэння) / Я. Галіеўская // Бібліятэчны свет. 2008. № 2. С. 30–31.

7. **Скалабан, В. У.** Засталіся Памяць, Кнігі і Музей / Віталь Скалабан // Бібліятэчны свет. 1997. № 4. С. 29.

8. **Гришина, Г. Ф.** «Вы просили рассказать о…» / Г. Ф. Гришина // С любовью о библиотеке : история библиотеки в воспоминаниях : к 80-летию Национальной библиотеки Беларуси / авт.-сост.: Л. М. Михальчук, Л. И. Курилина. Минск, 2002. С. 59.

9. Там жа.

10. **Міхайлаў, П**. Навуковец і педагог : да 75-годдзя з дня нараджэння Міколы Васілеўскага / П. Міхайлаў // Роднае слова. 2003. № 12. С. 23.

11. **Бикашова, И. И.** Как я узнала, что такое профсоюзы / И. И. Бикашова // С любовью о библиотеке : история библиотеки в воспоминаниях : к 80-летию Национальной библиотеки Беларуси / авт.-сост.: Л. М. Михальчук, Л. И. Курилина. Минск, 2002. С. 110.

12. **Чигирева, Р. М.** Это было… / Р. М. Чигирева // С любовью о библиотеке : история библиотеки в воспоминаниях : к 80-летию Нацио-

нальной библиотеки Беларуси / авт.-сост.: Л. М. Михальчук, Л. И. Курилина. Минск, 2002. С. 108.

13. Там жа. С. 106–108.

14. **Рабок, Л. М.** Рэкаталагізацыя беларускага фонду НББ / Л. М. Рабок // Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі і сацыяльная значнасць бібліятэк : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 29–30 кастр. 2003 г. / склад. Л. Г. Кірухіна ; рэдкал.: Р. С. Матульскі [і інш.]. Мінск, 2004. С. 141–143.

15. **Рабок, Л. М.** Праблемы фарміравання калекцыі нацыянальных дакументаў і фондаў беларусікі / Л. М. Рабок, Л. М. Навіцкая // Бібліятэка і грамадства : матэрыялы навук.-практ. канф., прысвеч. 70-годдзю Нац. б-кі Беларусі / склад.: Р. С. Матульскі [і інш.]. Мінск, 1993. С. 39–46.

16. **Рабок, Л. М.** Праблема фарміравання базы даных і фонду «беларусіка» / Л. М. Рабок // Бібліятэка і нацыянальная праграма «Спадчына» : матэрыялы навук.-практ. канф. / склад.: І. А. Прылішч [і інш.]. Мінск, 1992. С. 35–38.

17. **Прылішч, І. А.** Выданні беларускага замежжа ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі / І. А. Прылішч, Л. М. Рабок // Здабыткі : дакум. помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі ; [рэд.: І. А. Прылішч, Т. І. Рошчына]. Мінск, 1995. С. 36–41.

18. **Ганчарова, М. В.** Краязнаўчая работа абласных бібліятэк / М. В. Ганчарова // Анализ деятельности и методические рекомендации универсальным и отраслевым научным библиотекам Белоруссии, 1986–1990 гг. / М-во культуры Респ. Беларусь, Гос. б-ка Респ. Беларусь ; [сост.: З. А. Макеенко и др. ; ред. И. А. Прилищ]. Минск, 1992. С. 43–50.

19. **Казючыц, Р. К.** Асноўныя напрамкі краязнаўчай работы абласных бібліятэк / Р. К. Казючыц // Абласныя бібліятэкі : актуальныя аспекты дзейнасці / Нац. б-ка Беларусі ; [склад.: Л. Г. Кірухіна ; рэдкал.: В. А. Сабалеўская і інш.]. Мінск, 2004. С. 28–37 ; **Казючыц, Р. К.** Асноўныя напрамкі краязнаўчай работы / Р. К. Казючыц // Абласныя бібліятэкі Беларусі (1991–1995 гг.) : агляд дзейнасці / Нац. б-ка Беларусі ; [склад.: Т. У. Котава і інш.]. Мінск, 1998. С. 41–49.

20. **Тыпавая** схема класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь // Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк : метад. рэкамендацыі / Нац. б-ка Беларусі ; [склад.: Р. М. Чыгірова, М. У. Сокал]. Мінск, 1994. С. 90–101.

*Третья часть статьи «Беларусы» посвящена сотрудникам белорусского отдела. Наряду с опубликованными материалами в ней использованы данные из личных дел архива Национальной библиотеки Беларуси. Рассказывается о руководителях отдела, со-*

*трудниках, оставивших после себя конкретные результаты своей деятельности.*

*The third part of the article «The Belarusians» is dedicated to the staff of the Belarusian department of the National Library of Belarus. In addition to the published materials it uses data from the personal files of the library archive. It describes managers and employees of the department that achieved specific results during their working activity.*

***Букреева Е.М.*** *(Москва)*

## ДОКЛАД И.Н. УМАНСКОГО О ПРИЕМЕ БИБЛИОТЕКИ И.Х. КОЛОДЕЕВА

Я чувствую нравственное удовлетворение в том,
что мое скромное имя соединено с крупным событием в жизни
хранилища славы вечно памятного двенадцатого года.
*И.Н. Уманский*

Имя Ивана Николаевича Уманского, скромного служителя московского Музея 1812 года, тесно связано с историей передачи книжного собрания И.Х. Колодеева в Москву. Именно ему принадлежала честь быть командированным в Новоборисов в середине мая 1913 г. для приема библиотеки И.Х. Колодеева [1]. Прожив в Новоборисове более двух месяцев, И.Н. Уманский с честью выполнил возложенные на него обязательства и по возвращении в Москву на заседании Особого комитета сделал подробный доклад о проделанной работе [2].

Мы располагаем незначительными биографическими сведениями об И.Н. Уманском. В фонде Особого комитета по устройству в Москве Музея 1812 года, где хранятся послужные списки всех членов комитета, нет никаких его личных документов, кроме прошения о принятии на службу в Музей 1812 года, датированного 26 мая 1909 г. И.Н. Уманский писал: «По выходе в отставку в апреле сего года с действительной военной службы я в настоящее время не имею никакой службы и нахожусь в крайне затруднительном материальном положении, а посему имею честь